# ЖАНОЧЫ ПАРТРЭТ У ГІСТОРЫІ: ЕЎФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

*Крывецкая Е.Ю.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мікалаева Л.В. – канд. гіст. навук, дацэнт*

Распавядаецца пра легендарную жанчыну эпохі беларускага Сярэднявечча славутую асветніцу і праваслаўную святую Еўфрасінню з рода князёў Полацкіх.

У старажытным Полацку у сям'і князя Георгія нарадзілася дзяўчынка Прадслава. У сям'і яна атрымала вельмі добрую адукацыю. Яе вучылі, верагодна, запрошаныя бацькамі грэчаскія настаўнікі, духоўныя асобы, якія жылі пры двары. Дома была вялікая бібліятэка, і князёўна чытала самыя вядомыя на той час кнігі. Дзяўчынку ўражвалі полацкія храмы, асабліва Сафійскі сабор з яго багатымі размаляванымі фрэскамі. Ці не гэта ўжо тады вызначыла яе дарогу да служэння Богу? Быў жа ў Прадславы наперадзе звычайны жаночы лёс: нараджэнне дзяцей, сямейныя клопаты. Але дзяўчына выбірае іншую пуцявіну: супраць волі бацькоў ідзе ў манастыр, прымае пострыг і, атрымаўшы новае імя – Еўфрасіння, ахвяруе сябе Хрысту.

Мне хочацца верыць, што менавіта Божым знакам было для яе пакінуць мірское жыццё. З дазволу полацкага епіскапа яна пасялілася ў келлі-галубніцы Сафійскага сабора і пачала «кнігі пісаці сваімі рукамі». Гэты занятак патрабаваў умення, граматнасці, таму ім займаліся толькі мужчыны. І тое, што за гэты ўзялася жанчына, было подзвігам. Хутка Сафійскі сабор стаў цэнтрам духоўнага жыцця, культуры, пісьменнасці.

У заснаваных Еўфрасінняй манастырах працавалі кніжныя майстэрні – скрыпторыі. У іх ствараліся высокамастацкія кнігі, якія разыходзіліся па ўсёй Полацкай зямлі і за яе межамі. Такая была роля Еўфрасінні, як асветніцы. Ігумення садзейнічала і развіццю выяўленчага мастацтва. Яна згуртавала вакол сябе таленавітых людзей – мастакоў, ювеліраў, з'ўлялася адной з першых нашых мецэнатак.

Па яе заказе дойлід Іаан пабудаваў сусветна вядомы Спасаўскі сабор, распісаны унікальнымі фрэскамі. Фрэскавыя замалёўкі XII ст. амаль цалкам захаваліся да нашых дзён. І сёння яны ўражваюць сваёй дасканаласцю, хвалююць багаццем палітры, адухоўленасцю. З імем асветніцы звязана і стварэнне майстрам-ювелірам Лазарам Богшам славутага крыжа – шэдэўра старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва. Ён быў упрыгожаны залатымі пласцінкамі, каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і эмалевымі абразкамі з выявамі святых. У сярэдзіне крыжа ў пяці квадратных гнёздах былі змешчаны рэліквіі: кавалачкі крыжа Гасподняга з кроплямі Ісусавай крыві і каменя ад дамавіны Багародзіцы, часцінкі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзімітрыя. На крыжы быў выбіты тэкст, у якім паведамлялася імя яго стваральніка, кошт дарагіх металаў і камянёў, што пайшлі на яго аздабленне, а таксама змяшчаўся праклён тым, хто ўкрадзе ці прадасць святыню. І ўсё ж праклён не падзейнічаў. Пасля смерці князёўны - ігуменні крыж быў перавезены ў Смаленск, пазней – у Маскву. Полацкая святыня вярнулася на ранейшае месца толькі ў XVI ст. У пачатку 1920-х гг. крыж стаў экспанатам царкоўна-археалагічнага музея ў Мінску, адкуль быў дастаўлены ў Магілёў. У гады Вялікай Айчыннай вайны шэдэўр ювелірнага мастацтва знік. У сувязі з яго няўдалымі пошукамі было прынята рашэнне аднавіць свяшчэнны крыж. У 1997 г. брэсцкі майстар-ювелір вырабіў дакладную копію ўздвіжальнага Жыватворнага Крыжа святой Еўфрасінні, які зараз знаходзіцца ў Полацку ў Спаса-Праабражэнскай царкве.

На схіле жыцця Еўфрасіння Полацкая перадала ігуменства малодшай сястры Еўдакіі і здзейсніла паломніцтва ў Ерусалім. Захварэўшы ў дарозе, яна памерла ў 1173 г. і была пахавана ў Ерусалімскім манастыры святога Феадосія. Яе мошчы былі перазахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры, а ў 1910 г. перавезены ў заснаваную ёю Спаса-Праабражэнскую царкву ў Полацку.

Такім чынам, Еўфрасіння Полацкая пражыла вялікае жыццё, асветленае высакароднай ідэяй служэння народу. Яна стала адной з першых кананізаваных жанчын на ўсходніх землях, нябеснаю заступніцай усёй беларускай зямлі.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая / У. Арлоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – 220 с.*

*2. Арлоў, У. А. Таямніцы полацкай гісторыі / У. А. Арлоў. – Мінск : Беларусь, 1994. – 463 с. : іл.*

*3. Грыцкевіч, А. Ефрасіння Полацкая / А. Грыцкевіч // Славутыя імёны Бацькаўшчыны : Зборнік / Уклад. У. Гілеп і інш. ; рэдкал. : А. Грыцкевіч (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БФК, 2000. – 384 с. – С. 9–16.*